# Алесь бадак




Алесь Бадак
(нар. 28.02.1966)

*Алесь (Аляксандр Мікалаевіч) Бадак – беларускі паэт-песеннік, публіцыст, крытык. Нарадіўся 28 лютага 1966 года ў весцы Туркі Ляхавіцкага раёна.*

Заўседы, знаю, дзе, калі не буду,

Куды я ні паеду, я кругом

Ніколі сваю вёску не забуду

І сэрцу дарагі бацькоўскі дом.

Бо ў свеце даражэй няма нікога

З маленства родных так сваіх мясцін,

Бо ў свеце даражэй сабе другога

У жыцці ніколі краю не знайсці.



*З 1973 года па 1983 год вучыўся ў Федзюкоўская сярэдняй школе. Затым адразу паступіў у Белдзяржуніверсітэт на філалагічны факультэт. Пасля першага курса два гады служыў ў войску, у Манголіі. У 1990 годзе , пасля заканчэння ўніверсітэта, паўгода працаваў у Бюро прапаганды Саюза пісьменнікаў Беларусі. З 1991 года – у часопісе “Бярозка”, “Полымя”, “Маладосць” (загадчыкам аддзела прозы, намеснікам галоўнага рэдактара, да 2009 года).З 2009 года галоўным рэдактарам часопіса “Неман". У 2009-2012 гадах адначасова першы намеснік дырэктара РВУ “Літаратура і мастацтва”. З 2012 года намеснік дырэктара РВУ Выдавецкі дом “Звязда”. Лаўрат прэмій “Залаты апостраф” (2003г.) і “Залаты купідон”(2008г.). Аўтар паэтычных зборнікаў “Будзень”(1989), “За ценем самотнага сонца”(1995), “Маланкавы посах”(2004)… Піша для дзяцей : “Маленькі чалавек у вялікім свеце”(1995), “Верабей з рагаткай”(1999), “Незвычайнае падарожжа ў Крану Ведзьмаў”(2001)… На яго тэксты створаны песні “Падаюць зоры”, “Гаспадыня”, “Будзем жыць як набяжыць”, “Іншапланецянка”, “Школны баль”, “Вяселле” і іншыя.*



З успамінаў Алеся Бадака: “ Першы верш напісаў у 1977 годзе, зімой, пад канец года. Цяпер яго ўжо не помню, паколькі ён нідзе не быў надрукаваны. А ў друку (гэта была газета “Піянер Беларусі”), першыя вершы з’явіліся вясной 1979 года. Пасля друкаваўся ў газетах “Чырвоная змена”, “Зорька”, у раеннай газеце, , у часопісе “Бярозка”. У 1984 годзе упершыню надрукаваўся ў часопісе “Маладосць”. Пасля вершы змяшчаліся ў калектыўных зборніках, у альманаху “Дзень паэзіі”. А у 1989 годзе ў выдавецтве “Мастацкая літаратура” выйшла першая кніга вершаў “Будзень”. У 1982 годзе быў удзельнікам семінара маладых літаратараў у Каралішчавічах, а ў 1987 годзе – удзельнікам Усесаюзнага фестывалю маладых паэтаў у Алма-Аце. Пішу цяпер не толькь для дарослых, але і для дзяцей, і не толькі вершы , але і прозу. Акрамя таго пішу і песні. Сааўтарамі іх з’яўляюцца беларускія кампазітары У. Буднік, Л. Захлеўны, Э. Зарыцкі, А. Елісеенкаў, У. Дарохін і інш. І вельмі хочацца напісаць песню пра родную школу, з якой пачыналася дарога ў вялікае жыццё, пра якую вельмі часта узгадваю з пяшчотай і сумам. І няхай сення ў ёй многае змянілася, і выглядае яна куды прыгажэй і сучасней, у ёй па-ранейшаму захоўваецца цяпло майго дзяцінства. І самае галоўнае – кожную раніцу сюды прыходзяць многія мае любімыя настаўнікі…”

*Я твае пацалую далоні.*

*Мне так цяжка было без цябе,*

*Што баюся я нават сягоння*

*І на міг адпускаць ад сябе.*

*Падаюць зоры, падаюць зоры*

*Ціхай начною парой.*

*Падаюць зоры, падаюць зоры,*

*Светлаю стануць расой.*





Лаўрэат прэміі «Залаты апостраф» (2003)
Лаўрэат прэміі «Залаты купідон» за найлепшую кнігу года ў намінацыі «Публіцыстыка» (2008; за кнігу «Расліны: батанічныя эцюды»)
Лаўрэат прэміі СНД «Зоркі Садружнасці» (разам з А. Карлюкевічам) (2014)
Лаўрэат прэміі Васіля Віткі (2015)

# Біяграфія

- На пасадзе намесніка дырэктара РВУ «Выдавецкі дом „Звязда“»
- На пасадзе намесніка дырэктара РВУ «Выдавецкі дом „Звязда“»
- Нарадзіўся ў сям’і рабочага. У школе цікавіўся творчасцю Ясеніна, потым Андрэя Вазнясенскага, Якуба Коласа. У 1983 годзе пасля заканчэння школы паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Служыў у Савецкай Арміі (1984—1986). Пасля дэмабілізацыі працягнуў вучобу ва ўніверсітэце, які скончыў у 1990 годзе[2]. У тым жа годзе прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі.
- Працаваў пазаштатным карэспандэнтам-арганізатарам Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюзу пісьменнікаў Беларусі (1990—1991), рэдактарам аддзелу, адказным сакратаром, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Бярозка» (1991—2001), рэдактарам аддзела часопіса «Полымя» (2001—2002), загадчыкам аддзела прозы, адказным сакратаром, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць» (2002—2009). У 2009—2014 гадах галоўны рэдактар часопіса «Нёман». У 2014—2015 гадах галоўны рэдактар часопіса «Полымя».
- Адначасова ў 2009—2012 гадах 1-ы намеснік дырэктара Рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва». У 2012—2015 гадах намеснік дырэктара РВУ Выдавецкі дом «Звязда».
- З 2015 года дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Мы ніколі не станем радней,
І, на жаль, гэта ведаем самі.
І закончыцца значна раней,
Чым адбудзецца нешта між намі.

Сустракаемся рэдка зусім,
А ўсё больш расстаёмся з табою.
Наша шчасце — аранжавы дым,
Ціхі шлях ад самоты да болю.

І праводзячы ў ранішні час
У дарогу нясцерпна даўгую,
Нібы ў цэркаўцы белай абраз,
Я цябе асцярожна цалую.



# Не прасі прабачэння дарэмна

Не прасі прабачэння дарэмна:
Ўсё дала, што магла ты мне даць.
Ты мне болей ужо не патрэбна,
Ды не хочацца адпускаць.

Я знайду цябе ў парку халодным;
— Можа, прыйдзеш яшчэ да мяне?
Вецер з вуснаў сарве тыя словы
І з размаху мне ў твар шпурляне.